*УДК [811.161.3+811.111]'373.7:177.6*

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ КАНЦЭПТУ "КАХАННЕ" Ў БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ ФРАЗЕАЛОГІІ, АЛЬБО ЯШЧЭ РАЗ ПРА КАХАННЕ

**Людміла Кулік**

*Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.В. Сухога*
*Gomel Sukhoi State Technical University*
*пр. Кастрычніка, д. 48, Гомель, 246746, Рэспубліка Беларусь*
*kulikludmila@mail.ru*

Кулік Л. Репрезентація концепту "Любов" у білоруській та англійській фразеології, або Ще раз про кохання

У статті досліджено репрезентацію концепту "Любов" на матеріалі білоруської та англійської фразеології крізь призму порівняльного й лінгвокультурологічного аспектів. Акцентовано на основних параметрах інтенсивності прояву відповідного почуття. Виявлено загальні риси та національні особливості культурного образу, закодованого у внутрішній формі білоруських та англійських фразеологічних одиниць. З'ясовано, що аналіз фразеологічної вербалізації концепту "Любов" допомагає відтворити етнокультурний образ і особливості менталітету носіїв білоруської та англійської мов.

*Ключові слова:* фразеологічна одиниця, концепт, порівняльний і лінгвокультурологічний аспекти, загальні риси, національні особливості.

Kulik L. Representation of the concept "Love" in the Belarusian and English phraseology, or Once again about love

The article examines the phraseological representation of the concept of "Love" by native speakers of Belarusian and English, which is one of the basic concepts that appear in representatives of various cultures. Attention is focused on the main parameters of the intensity of this feeling. Common features and national features of the cultural image encoded in the internal form of Belarusian and English phraseological units are established. The analysis of phraseological verbalization of the concept "Love" helps to recreate the ethno-cultural image and features of the mentality of Belarusian and English speakers.

The results of the research demonstrate that the Belarusian and English phraseological units representated the concept of "Love" are divided into several semantic groups. These groups describe the degree of depth and strength of the feeling, or certain stages of it. For example, phraseological units characterize the origin of love, the highest degree of this feeling, and its completion: *to fall in love* 'to fall in love' – *with all* one's *heart* <*and soul*> '(to love, believe, be proud, etc.) sincere, heartfelt)' (1$^{st}$ meaning) – *to fall out of love* 'to stop loving'.

 © Л. Кулік, 2020.

Linguistic meaning and cultural content of the phraseological units cause their special role in the speaking – to characterize the person's attitude to the feeling of love and pay attention to the different ways of their display. The national-cultural interpretation of the concept "Love" in phraseology of native speakers of Belarusian and English shows that to imagine the part of their language picture of the world could be exactly through the description of the stereotypes in the inner form of the phraseological units. The conclusions of the article can be used in giving courses in the field of phraseology, cultural linguistics, inter-language communication, theory and practice of translation and compiling of phraseological dictionaries.

*Key words:* phraseological unit, concept, comparative and linguacultural aspects, common features, national peculiarities.

**Пастаноўка праблемы і яе сувязь з важнымі навуковымі задачамі**. На думку семіёлага і культуролага Ю. Сцяпанава, сама духоўная культура кожнага грамадства заключаецца ў значнай ступені ў аперацых з базавымі канцэптамі [Stepanov / Степанов 2004 : 6]. Яны з'яўляюцца свайго рода падмуркам, які выкарыстоўваецца для стварэння глабальных адзінак пазнання чалавека пра свет. У межах пэўнай мовы канцэпты ўтвараюць канцэптасферу, на аснове якой будуецца канцэптуальная карціна свету.

Вырашэнне пытанняў, звязаных з канцэптуалізацыяй свету ў фразеалогіі, дазваляе зразумець існуючую аперцэпцыю носьбітаў мовы, фарміраванне іх менталітэту і нацыянальнага характару, успрыманне якога раскрываецца ў выніку лінгвакультуралагічнага падыходу да вывучэння фразеалагічных адзінак (ФА).

Лінгвакультуралагічны падыход да вывучэння адной мовы адносна другой характарызуецца "сінергетычным узаемадзеяннем моўнага, камунікатыўнага, прагматычнага, псіхалагічнага і культурнага аспектаў" [Alefirenko / Алефиренко 2008 : 182] і разам са структурна-семантычным падыходам адыгрывае першасную ролю пры падборы адпаведнікаў у другой мове. Пры лінгвакультуралагічным падыходзе да пытанняў, звязаных з унікальнай семантыкай і вобразнай асновай ФА розных моў, "нацыянальна-культурны кампанент плана зместу фразеалагізмаў… грунтуецца, як правіла, на вобразных складніках і ўвязваецца з кагнітыўна значнымі адрозненнямі моў" [Dobrovolskiy / Добровольский 1997 : 47].

© Л. Кулік, 2020. 

**Аналіз апошніх даследаванняў і публікацый**. У сувязі з тым, што ўвасабленне свету ў мове залежыць ад таго, якім чынам яго прымае чалавечы розум, сёння даследаванне нацыянальна-культурных асаблівасцей фразеалогіі пэўнай мовы выходзіць далёка за межы лінгвістыкі і звязана з "вывучэннем свету вобразаў, якія адлюстроўваюцца ў плане зместу фразеалагічных адзінак, і іх суадносін з тыповымі сітуацыямі для этнасу" [Kovshova / Ковшова 1996 : 11–12]. Вырашаючы пытанні нацыянальна-культурнай спецыфікі ФА, даследчыкі фразеалогіі выяўляюць універсальнасць і ўнікальнасць іх семантыкі і вобразна-сімвалічнага зместу, асвятляюць і імкнуцца вытлумачыць "экстралінгвістычную інфармацыю як сэнсаўтваральны кампанент ФА" [Kovshova / Ковшова 1996 : 28], яны ўзнаўляюць моўную карціну свету, каменціруюць лінгвакультуралагічныя каштоўнасці, а таксама звяртаюцца да пытанняў выяўлення пэўных паняццяў у розных мадэлях свету: М. Алефірэнка, Т. Валодзіна, Д. Гудкоў, М. Каўшова, У. Коваль, А. Кові, В. Ляшчынская, В. Маслава, П. Скандэра і інш. Даследчыкі, якія ў той ці іншай меры закранаюць нацыянальна-культурную спецыфіку ФА, каменціруюць іх кампаненты ў межах тэматычнага поля па іх адпаведнасці на лексічным і граматычным узроўнях плана выражэння, а таксама па адпаведнасці ФА розных моў у тыпе метафарычнага пераносу, па адпаведнасці кампанентаў, якія ўдзельнічаюць у структурызацыі вобразна матываванай унутранай формы ФА – галоўнага аспекту іх зместу.

**Мэта дадзенага артыкула** – даследаваць у параўнальна-супастаўляльным і лінгвакультуралагічным аспектах фразеалагічную рэпрэзентацыю носьбітамі беларускай і англійскай моў канцэпту "Каханне" – аднаго з базавых паняццяў, якія праяўляюцца ў прадстаўнікоў самых розных культур; устанавіць універсальныя рысы і нацыянальныя асаблівасці канцэптуальных фрагментаў моўнай карціны свету носьбітаў беларускай і англійскай моў.

**Выклад асноўнага матэрыялу**. Выдзяленне фразеалагізмаў і іх вывучэнне для даследавання канцэпту "Каханне" тлумачым найперш тым, што менавіта фразеалагічныя адзінкі выступаюць найбольш насычанымі культурным сэнсам адзінкамі мовы. Выконваючы ролю знакаў культуры, яны


© Л. Кулік, 2020.

захоўваюць калектыўныя веды, якія былі здабыты і захаваны соцыумам на працягу стагоддзяў. Іншымі словамі, фразеалагізмы, ва ўнутранай форме якіх закадзіравана інфармацыя пра побыт, звычкі і традыцыі пэўнага народа, “валодаюць уласцівасцю матываванасці” [Bolshoy / Большой 2006 : 6].

Актуальнасць вывучэння фразеалагічных адзінак беларускай і англійскай моў у параўнальна-супастаўляльным і лінгвакультуралагічным аспектах абумоўлена зменамі ў тэорыі фразелогіі, што ўзніклі ў мовазнаўстве на сучасным этапе яго развіцця, і заключаюцца ў выяўленні агульных рыс і нацыянальных асаблівасцей мовы пэўнага народа, якая разглядаецца як неад’емны кампанент культуры асобнага этнасу. Сродкам увасаблення нацыянальна-культурных асаблівасцей мовы выступае ўнутраная форма ФА, а сродкам, які ўказвае на гэтыя асаблівасці, з’яўляецца “інтэрпрэтацыя вобразнай асновы ў знакавай культурна-нацыянальнай “прасторы” дадзенай моўнай супольнасці” [Teliya / Телия 1996 : 215].

У “Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы” пад рэдакцыяй М. Судніка і М. Крыўко лексема *каханне* тлумачыцца як ‘вялікае сардэчнае пачуццё да пэўнай асобы другога полу’ [Tlumachalnyi / Тлумачальны 2005 : 286]. У англійскай мове лексема *love* валодае больш шырокім значэннем: ‘вельмі моцнае эмацыянальнае і сэксуальнае пачуццё да каго-н.’, ‘пачуццё сімпатыі і клопату да каго-н., напрыклад, да члена вашай сям’і ці блізкага сябра’, ‘хто-н., з кім у вас ёсць сэксуальныя або рамантычныя адносіны’, ‘хто-н., хто вам вельмі падабаецца, таму што ён добры’, ‘выкарыстоўваецца ў канцы ліста да каго-н., каго вы добра ведаеце’, ‘выкарыстоўваецца ў размове з мужам, жонкай, дзяўчынай і г. д.’, ‘лік без ачкоў у тэнісе’[Macmillan 2008 : 898–899].

Зыходзячы з семантыкі лексемы ў беларускай і англійскай мовах, разумеем, што каханне – гэта пачуццё, якое перадае “глыбокія” душэўныя пачуцці і хваляванні. У англійскай мове да платанічнага пачуцця далучаюцца сэксуальныя жаданні, што знаходзіць адлюстраванне ў ФА *to make love* (дасл. – рабіць каханне) ‘займацца каханнем’ (2-е значэнне).

ФА, якія рэпрэзентуць канцэпт ‘Каханне’, падзяляюцца на некалькі семантычных груп, якія апісваюць ступень глыбіні і моцнасці пачуцця, альбо пэўныя стадыі пачуцця. Так, намі вылучаны ФА, якія характарызуюць узнікненне кахання, найвышэйшую ступень праўлення гэтага пачуцця і яго завяршэнне. Найбольш яскрава гэта можна праілюстраваць наступнымі ФА англійскай мовы: *to fall in love* (дасл. – падаць у каханне) ‘закахацца’ – *with all* one’s *heart <and soul>* (дасл. – з усім сэрцам <і душой>) ‘бязмежна, шчыра, сардэчна (любіць, кахаць, верыць, ганарыцца і пад.)’ (1-е значэнне) – *to fall out of love* (дасл. – выпадаць з кахання) ‘разлюбіць, перастаць кахаць’.

Вельмі часта ў жыцці сапраўднаму пачуццю кахання папярэднічае сімпатыя, што і адлюстроўваецца ў бел. ФА *западаць / упадаць у вока / у вочы*’ выклікаць у каго-н. пачуццё сімпатыі да сябе’, ‘падабацца, быць даспадобы’ (1-е значэнне); *па густу* ‘падабаецца’; *да сэрца* ‘падабаецца’ і інш. і англ. ФА *calf / puppy love* (дасл. – цялячае / шчанюковае каханне) ‘дзіцячая закаханасць; юнацкае захапленне’; *to catch* smb.’s *eye* (дасл. – злавіць чыё-н. вока) ‘быць прывабным для каго-н.’ і інш.

Заўважым, што ў беларускіх і англійскіх ФА спецыфічным інструментам прыцягвання ўвагі супрацьлеглага пола з’яўляюцца вочы, якія сімвалічна атаясамліваюцца са зброяй, сродкам паражэння альбо валодаюць незвычайнай чароўнай сілай: бел. *страляць вачамі (-ыма, вочкамі)* ‘какетліва паглядаць на каго-н.’; *<вясёлыя> чорцікі скакалі ў вачах* ‘хто-н. кідае гуллівыя, вясёлыя позіркі’; *строіць вочкі* ‘какетліва паглядаць на каго-н.’; *завязваць вочы* ‘выклікаць у каго-н. любоў, прымушаць пакахаць каго-н.’ і інш. і англ. *to snap eyes at* smb. (дасл. – шчоўкаць вачамі на каго-н.) ‘какетліва паглядаць на каго-н.’); *to make eyes at* smb. (дасл. – строіць вочы каму-н.) ‘фліртаваць з кім-н.’; *to give* smb. *the glad eye* (дасл. – даваць каму-н. шчаслівы позірк) ‘какетліва паглядаць на каго-н.’ і інш. Вобразы пералічаных ФА ў цэлым рэпрэзентуюць стэрэатыпныя ўяўленні пра тыповыя, часцей жаночыя, паводзіны ў сітуацыі, калі жанчына намякае на сваю сімпапыю ў адносінах да мужчыны альбо імкнецца падабацца яму.

Супастаўляльнае даследаванне беларускіх і англійскіх ФА дазваляе ўстанавіць, што каханне валодае некалькімі

 © Л. Кулік, 2020.

параметрамі інтэнсіўнасці, а менавіта даўжынёй, сілай і якасцю. Напрыклад: бел. *без памяці* ‘вельмі моцна, страсна (кахаць каго-н., захапляцца чым-н.)’ (2-е значэнне); *без аглядкі* ‘вельмі моцна, бязмежна, не раздумваючы (кахаць, верыць і інш.)’ (3-е значэнне); *да вар’яцтва* ‘вельмі моцна, бязмежна (любіць, ненавідзець і пад.)’ (1-е значэнне); *па <самыя> вушы* ‘вельмі моцна, бязмежна (закахацца)’ (2-е значэнне) і англ. *with all* one’s *heart <and soul>* (дасл. – з усім сэрцам <і душой>) ‘бязмежна, шчыра, сардэчна (любіць, кахаць, верыць, ганарыцца і пад.)’ (1-е значэнне); *to be fathoms deep in love* (дасл. – быть па сажні закаханым у каго-н.) ‘вельмі моцна кахаць’; *to be over head and ears* (in love) (дасл. – быць вышэй галавы і вушэй (у каханні) ‘бязмежна кахаць каго-н.’ і інш. Як відаць з прыкладаў, даволі часта высокая ступень праяўлення кахання перадаецца ў беларускай мове пры дапамозе адмаўлення, выражанага прыназоўнікам *без*, і выкарыстоўваецца для актуалізацыі значэння ‘вельмі моцна кахаць’.

Вышэйшым фізічным праяўленнем кахання з’яўляецца пачуццё страсці. У выніку аналізу ФА дзвюх моў намі былі зафіксаваны толькі англійскія ФА, у аснове якіх знаходзіцца метафара страсць – полымя: *to catch / take fire* (дасл. – схапіць / узяць агонь) ‘успыхнуць, загарэцца; запалаць (каханнем, цікавасцю, страсцю і пад.)’; *fire and fury* (дасл. – агонь і апантанасць) ‘апантаная страсць’; *a fire in the blood* (дасл. – агонь у крыві) ‘страсць, палкасць’ і інш. Даныя ФА ў сваёй вобразнай аснове змяшчаюць уяўленні носьбітаў мовы аб агню як небяспечнай з’яве, якая паглынае ўсё на сваім шляху. Адсутнасць падобных ФА ў беларускай мове тлумачым асаблівасцю культуры і ментальнасці беларусаў, для якіх каханне – “свайго роду “падмурак”, на якім павінна трымацца сям’я” [Pivavar / Півавар 2015 : 114], а праяўленне страсці парушае маральныя прынцыпы нацыі, высокі ўзровень чысціні і цнатлівасці. Асаблівасцю адносін паміж мужам і жонкай у беларускіх сем’ях з’яўлялася стрыманасць. “Каханне – гэта адносіны паміж двума, і афішыраваць іх лічылася ў народзе непрыстойным. Муж не цалаваў і не абдымаў жонку пры людзях” [Belarusyi : Беларусы 2001 : 28].

© Л. Кулік, 2020. 

Спынім увагу на ФА, якія не абазначаюць непасрэдна пачуццё кахання, але ўказваюць на яго вынік, а менавіта на зачацце дзіцяці альбо яго нараджэнне. Заўважым, што тут мы маем на ўвазе не тыя ФА, якія рэпрэзентуюць пачатак жыцця – нараджэнне і адносяцца да фразеасемантычнага поля ‘жыццё’, а тыя, што неадабральна апісваюць інтымныя моманты адносін. Так, ФА *пуза / жывот на нос лезе / палезе* ‘хто-н. у стане цяжарнасці; звычайна пра жанчыну, якая не знаходзіцца ў шлюбе’ адлюстроўвае складзенае ў свядомасці беларусаў мінулых стагоддзяў стэрэатыпнае, адмоўнае стаўленне да незамужняй цяжарнай жанчыны, што ўзмацняецца яшчэ і ўжываннем размоўнай лексемы *пуза*, якая амаль заўсёды нясе адмоўную канатацыю [Kulik / Кулік 2011 : 139]. У англійскай мове зафіксавана ФА *baby / child of love* (дасл. – дзіця кахання) ‘дзіця, якое нарадзілся па-за шлюбам’, у якой у адрозненне ад беларускай ФА адсутнічае негатыўная канатацыя.

Але ўсё ж такі звычайна ўзаемныя пачуцці маладых людзей прыводзяць да жаніцьбы, што і адлюстроўваецца ў наступных ФА дзвюх моў: бел. *прапанова рукі і сэрца* ‘просьба хлопца да жанчыны стаць яго жонкай’; *аддаваць руку і сэрца* ‘станавіцца жонкай каго-н., выходзіць замуж за каго-н.’ і англ. *to tie marriage / nuptial knot* (дасл. – завязаць шлюбны вузел) ‘злучыць вузамі шлюбу, правесці абрад шлюбу (пра святара)’, ‘пажаніцца’. У той жа час у англійскай мове вылучаецца ФА, якая рэпрэзентуе іншую прычыну ўступлення ў шлюб: *a marriage of convenience* (дасл. – шлюб па выгодзе) ‘шлюб па разліку’; *to please* one’s *eye and plague* one’s *heart* (дасл. – дагаджаць чыйму-н. воку і мучыць сэрца) ‘выйсці замуж па разліку, насуперак пачуццям’ і інш.). Апошняя ФА ілюструе адсутнасць балансу паміж знешнім і ўнутраным у чалавеку. Для апісання стэрэатыпнай сітуацыі эмацыянальнага перажывання дзяўчыны ў ФА выкарыстоўваецца метафарычны перанос. У сувязі з тым, што носьбіты англійскай мовы характарызуюцца пэўным кансерватызмам, яны не імкнуцца вербалізаваць нюансы любоўных перажыванняў і пакідаюць іх па-за межамі знешніх праяўленняў – у сэрцы.

Прапанова выйсці замуж не заўсёды ўспрымаецца станоўча. Так, у беларускіх ФА *атрымліваць гарбуз (-а)*

 © Л. Кулік, 2020.

‘абнеслаўляцца пры сватаўстве, не дабіўшыся згоды на шлюб’, *надаваць гарбузоў* ‘шмат разоў адмовіць таму, хто сватаецца’. У аснове пералічаных ФА знаходзіцца добра вядомы раней звычай “даваць маладому або свату гарбуз як знак нязгоды, калі дзяўчына ці яе бацька непрыхільна ставіліся да сватання” [Lepeshau /Лепешаў 2004 : 42].

Гадавіны з дня вяселля маюць свае назвы ў залежнасці ад колькасці пражытых разам гадоў: *сярэбранае вяселле* / *the silver wedding* ‘дваццаціпяцігадовы юбілей сямейнага жыцця’, *залатое вяселле* / *the golden wedding* ‘пяцідзесяцігадовы юбілей сямейнага жыцця’, *брыльянтавае вяселле* / *the diamond wedding* ‘сямідзесяціпяцігадовы юбілей сямейнага жыцця’.

Але ж сапраўднае каханне бясконцае, а калі і сканчаецца, то адначасова з жыццём чалавека. Пацверджанне гэтаму знаходзім у ФА беларускай мовы *да смерці* ‘вельмі (хацець, любіць, палохаць, бянтэжыць і інш.); *да магілы* ‘да самай смерці, да канца жыцця (помніць, кахаць, не забываць і пад.)’; *да апошняга дыхання / уздыху* (біцца, змагацца, кахаць і інш.) ‘да самай смерці, да канца жыцця’ і інш.

Сімвалічным цэнтрам канцэнтрацыі эмоцый чалавека з’яўляецца сэрца. Адсюль і шырокае задзейнічанне кампанента *сэрца* як органа-сімвала кахання ў беларускіх і англійскіх ФА. Заўважым, кампанент *сэрца* праяўляе актыўнасць у ФА, якія адлюстроўваюць уяўленні носьбітаў мовы аб метафарычным цэнтры сусвету асобы – душы, якая выступае кантэкстуальным сінонімам да слова *каханне*. Так, у вобразнай аснове ФА закадзіраваны шырокі дыяпазон праяўлення пачуццяў (ад сімпатыі да кахання): бел. *па сэрцы* ‘падабаецца’; *аддаваць сэрца* ‘кахаць каго-н.’; *не чуць душы* (у кім) ‘вельмі моцна, бязмежна любіць, глыбока паважаць каго-н.’ і інш. і англ. *after* one’s *<own> heart* (дасл. – па сэрцы) ‘падабаецца’; *to lose* one’s *heart <to smb. / smth.>* (дасл. – губляць сваё сэрца) ‘закахацца, аддаць сваё сэрца (каму-н. альбо чаму-н.)’; *to give* one’s *heart to smb.* (дасл. – аддаваць сваё сэрца каму-н.) ‘аддаць сваё сэрца каму-н.’.

У вобразнай аснове беларускіх і англійскіх ФА закадзіраваны ўяўленні пра тое, што адчуць каханне можна

толькі ўсім сэрцам, а для таго, каб упадабаць каго-н., дастаткова задзейнічаць пэўную яго частку: *усім сэрцам* і *with all* one's *heart <and soul>* (дасл. – з усім сэрцам <і душой>) 'бязмежна, шчыра, сардэчна (любіць, кахаць, верыць, ганарыцца і пад.)' (1-е значэнне); *to have a soft / warm corner / place in* one's *heart for smb.* (дасл. – мець мяккі / чулы / цёплы кут / месца ў сэрцы для каго-н.) 'адчуваць душэўнае імкненне, цёплыя пачуцці да каго-н., мець сімпатыю, быць неабыякавым да каго-н.; (ад душы) спачуваць каму-н.'. Спосабы магчымага "вызвалення" ад кахання закадзіраваны толькі ў беларускіх ФА з кампанентам *сэрца*: *выкідаць з сэрца / з душы* 'пераставаць кахаць каго-н., любіць што-н.'; *вырываць з <свайго> сэрца* 'прымушаць сябе забыць каго-н. блізкага, каханага ці што-н. запаветнае, дарагое'.

**Высновы і перспектывы далейшых навуковых даследаванняў**. Параўнальна-супастаўляльная і лінгвакультуралагічная інтэрпрэтацыя беларускіх і англійскіх ФА сведчыць аб тым, што фразеалогія пэўнай мовы, захоўвае і перадае праз час культурны вопыт этнасу, выпрацаваныя ім нацыянальныя ўстаноўкі і правілы. Так, усе адзначаныя ФА беларускай і англійскай моў уяўляюць сабой своеасаблівыя мікратэксты, якія ўтрымліваюць розныя дадатковыя веды пра каханне. Яны ілюструюць вербалізацыю розных ступеней інтэнсіўнасці праяўлення пачуцця, а закадзіраваная ў іх унутранай форме інфармацыя накіравана патлумачыць асобныя моманты паводзін асобы ў стане кахання. Для беларускіх і англійскіх ФА бясспрэчнай прыкметай канцэпту "Каханне" з'яўляецца станоўчая каштоўнасць гэтага высокага пачуцця, іншымі словамі, каханне надзяляецца агульнааксіялагічнай ацэнкай вышэйшага шчасця. Акрамя таго, аналіз ФА ілюструе асаблівае культурнае значэнне асобных кампанентаў як адзінак, якія апісваюць ступень глыбіні і моцнасці пачуцця, альбо пэўныя стадыі пачуцця, і дазваляе ўзнавіць этнакультурныя вобразы і асаблівасці менталітэту беларусаў і англічан.

**Літаратура**

1. Алефиренко Н. Ф. Фразеология в свете современных лингвистических парадигм : монография. Москва : ЭЛПИС, 2008. 271 с

2. Беларусы. Т. 5. Сям'я / рэдкал.: В. К. Бандарчык і інш. Мінск : Бел. навука, 2001. 375 с.

 © Л. Кулік, 2020.

3. Большой фразеологический словарь русского языка. Значение. Употребление. Культурологический комментарий / редкол.: В. Н. Телия (отв. ред.). Москва : АСТ-ПРЕСС КНИГА, 2006. 784 с.

4. Добровольский Д. О. Национально-культурная специфика во фразеологии (I). *Вопросы языкознания*. 1997. № 6. С. 37–48.

5. Ковшова М. Л. Культурно-национальная специфика фразеологических единиц (когнитивные аспекты) : дис. … канд. филол. наук : 10.02.19. Москва, 1996. 244 с.

6. Корсак Л. Д. Англа-беларускі слоўнік фразеалагізмаў paраўнальнага тыпу. Мінск : Выш. шк., 1984. 122 с.

7. Кулік Л. У., Ляшчынская В. А. Англа-беларускі слоўнік саматычных фразеалагізмаў ; Беларуска-англійскі слоўнік саматычных фразеалагізмаў. Гомель : ГДУ, 2010. 84 с.

8. Кулік Л. У. Саматычныя фразеалагізмы як адзінкі цялеснага кода культуры. *Скарына і наш час* : матэрыялы V Міжнароднай навуковай канф. Гомель, 2011. С. 136–139.

9. Кунин А. В. Англо-русский фразеологический словарь. Москва : Рус. яз. Медиа, 2004. 512 с.

10. Кунин А. В. Большой англо-русский фразеологический словарь : ок. 20000 фразеологических единиц. Москва : Живой яз., 1998. 944 с.

11. Лепешаў І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў : у 2 т. Мінск : Беларус. энцыкл., 2008.

12. Лепешаў І. Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў. Мінск : Беларус. энцыкл., 2004. 448 с.

13. Литвинов П. П. Англо-русский словарь наиболее употребительных фразеологических выражений. Москва : Яхонт, 2001. 400 с.

14. Півавар К. С. Беларуская ментальнасць у моўнай прасторы мастацкага тэксту : манаграфія. Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2015. 155 с.

15. Степанов Ю. С. Константы: Словарь русской культуры. Москва : Акад. проект, 2004. 992 с.

16. Телия В. Н. Русская фразеология. Семантический, прагматический и лингвокультурологический аспекты. Москва : Шк. “Яз. рус. культуры”, 1996. 288 с.

17. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : больш за 65000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. Мінск : Беларус. энцыкл., 2005. 784 с.

18. Cowie A. P. Oxford dictionary of current idiomatic English : Phrase, clause and sentence idioms : Vol. 2. Oxford : Oxford University press, 1994. 685 p.

19. Macmillan English dictionary : for advanced learners / Macmillan Education. China [etc.] : Macmillan Publishers Limited ; AandC Black Publishers, 2008. 1748 p.

20. The Penguin concise English dictionary / complied by G. N. Garmonsway with Jacqueline Simpson. London : Claremont Books, 1995. 842 p.

**References**

1. Alefirenko N.F. Frazeologiya v svete sovremennyih lingvisticheskih paradigm : monografiya. Moskva : ELPIS, 2008. 271 s.

© Л. Кулік, 2020. 

2. Belarusyj. T. 5. Symja / redkal.: V. K. Bandarchyjk i insh.. Minsk : Bel. navuka, 2001. 375 s.

3. Bolshoy frazeologicheskiy slovar russkogo yazyika. Znacheniye. Upotrebleniye. Kulturologicheskiy kommentariy / redkol.: V. N. Teliya (otv. red.). Moskva : AST-PRESS KNIGA, 2006. 784 s.

4. Dobrovolskiy D. O. Nacionalno-kulturnaya specifika vo frazeologiyi (I). *Voprosyi yazyikoznaniya*. 1997. № 6. S. 37–48.

5. Kovshova M. L. Kulturno-nacyionalnaya specifika frazeologicheskih edinic (kognitivnyiye aspektyi) : dis. … kand. filol. nauk: 10.02.19. Moskva, 1996. 244 s.

6. Korsak L. D. Angla-belaruski slounik frazealagizmau paraunalnaga tyipu. Minsk : Vyish. shk. 1984. 122 s.

7. Kulik L. U., Lyashchyinskaya V. A. Angla-belaruski slounik samatyichnyih frazealagizmau ; Belaruska-angliyski slounik samatyichnyih frazealagizmau ;. Gomel : GDU, 2010. 84 s.

8. Kulik L. U. Samatyichnyiya frazealagizmyi yak adzinki cyalesnaga koda kulturyi. *Skaryina i nash chas* : matetyiyalyi V Miznarodnay navukovay kanf. Gomel, 2011. S. 136–139.

9. Kunin A. V. Anglo-russkiy frazeologicheskiy slovar. Moskva : Rus. yaz. Media, 2004. 512 s.

10. Kunin A. V. Bolshoy anglo-russkiy frazeologicheskiy slovar : ok. 20000 frazeologicheskih edinic. Moskva : Zivoy yazyik, 1998. 944 s.

11. Lepeshau I. Ya. Slounik frazealagizmau : u 2 t. Minsk : Belarus. encikl., 2008.

12. Lepeshau I. Ya. Etyimalagichnyi slounik frazealagizmau. Minsk : Belarus. encikl., 2004. 448 s.

13. Litvinov P. P. Anglo-russkiy slovar naiboleye upotrebitelnyih frazeologicheskih vyirazeniy. Moskva : Yahont, 2001. 400 s.

14. Pivavar K. S. Belaruskaya mentalnasc u mounay prastoryi mastackaga tekstu : managrafiya. Vicebsk : VDU imya P. M. Masherava, 2015. 155 s.

15. Stepanov Yu. S. Konstantyi: Slovar russkoy kulturyi. Moskva : Akad. proyect, 2004. 992 s.

16. Teliya V. N. Russkaya frazeologia. Semanticeskiy, pragmaticeskiy I lingvokulturologiceskiy aspecty. Moskva : Shk. “Yaz. rus. kulturyi”, 1996. 288 s.

17. Tlumachalnyi slounik belaruskay movy : bolsh za 65000 slou / pad red. M. R. Sudnika, M. N. Kryiuko. Minsk : Belarus. encikl., 2005. 784 s.

18. Cowie A. P. Oxford dictionary of current idiomatic English : Phrase, clause and sentence idioms : Vol. 2. Oxford : Oxford University press, 1994. 685 p.

19. Macmillan English dictionary : for advanced learners / Macmillan Education. China [etc.] : Macmillan Publishers Limited ; AandC Black Publishers, 2008. 1748 p.

20. The Penguin concise English dictionary / complied by G. N. Garmonsway with Jacqueline Simpson. London : Claremont Books, 1995. 842 p.

*Стаття надійшла до редакції 27.08.2020 р.*
*Прийнята до друку 22.10.2020 р.*



© Л. Кулік, 2020.